Тэндэнцыі

# ЗБАЛАНСАВАНА І АПЕРАТЫЎНА

## Фінансаваму сектару Беларусі ўдаецца супрацьстаяць знешнім і ўнутраным шокам

**Пра гэта заявіў начальнік упраўлення фінансавай стабільнасці Нацыянальнага банка Ігар МАГІЛЕВІЧ на пашыраным пасяджэнні праўлення Нацбанка, паведаміла БелТА.**

### НАСУПЕРАК САНКЦЫЯМ

«Фінансавы сектар Беларусі ўжо больш за пяць кварталаў функцыянуе ў стрэсавых умовах. Сярод асноўных пагроз фінансавай стабільнасці на першы план сёлета вылучыліся нарастаючы санкцыйны ціск і няўстойлівасць рэсурснай базы банкаў. Тым не менш фінансаваму сектару краіны ўдаецца супрацьстаяць знешнім і ўнутраным шокам. Ключавыя паказчыкі фінансавай стабільнасці ў першым паўгоддзі 2021 года знаходзіліся ў прымальных дыяпазонах», — заўважыў Ігар Магілевіч. Паводле яго слоў, нарматывы бяспечнага функцыянавання банкамі і ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» у цэлым выконваліся. «Захоўвалася ўстойлівая работа страхавога сектара, лізінгавых арганізацый і сектара іншых фінансавых пасрэднікаў. Забяспечана стабільнае і бесперабойнае функцыянаванне плацежнай сістэмы краіны. Узровень сістэмных рызык не перавышае крытычнай адзнакі. Забяспечваецца плацежаздольнасць і ліквіднасць банкаў. Пакрыццё нарматыўным капіталам прынятых банкамі рызык у першым паўгоддзі 2021 года застаецца на высокім узроўні. Дастатковасць нарматыўнага капіталу па банкаўскім сектары складае 18,3 % і істотна перавышае мінімальна дапушчальны ўзровень», — падкрэсліў прадстаўнік Нацбанка.

Рэнтабельнасць актываў з пачатку года павялічылася на 0,3 працэнтнага пункта — да 1,5 % па стане на 1 ліпеня. Таксама вырасла рэнтабельнасць нарматыўнага капіталу банкаў. Прыбытак банкаўскага сектара за першае паўгоддзе склаў каля Br763 млн, перавысіўшы на Br339 млн прыбытак за аналагічны перыяд папярэдняга года. Такі рост прыбытку быў забяспечаны расфарміраваннем банкамі спецыяльных рэзерваў, якія знізіліся на Br528 млн.

Фінансавы сектар працягне збалансавана і аператыўна рэагаваць на ўзнікаючыя пагрозы. «Вядома, прадказаць новыя шокі, іх чарговасць і маштаб вельмі складана. Многія фактары знаходзяцца па-за сферай уплыву Нацбанка. Аднак рэгулятар пільна сочыць за развіццём сітуацыі ў эканоміцы і на фінансавых рынках. Аналізуюцца магчымыя рызыкі і слабыя месцы фінансавай сістэмы, знешнія пагрозы фінансавай стабільнасці», — адзначыў Ігар Магілевіч.

### ІНФЛЯЦЫЯ ЗАПАВОЛІЦЦА

Нацыянальны банк прагназуе інфляцыю па выніках года на ўзроўні 9 %. Пра гэта паведаміў **член праўлення, начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацбанка Дзмітрый МУРЫН**.

«У існуючых умовах чакаецца, што па выніках III квартала гадавая інфляцыя захаваецца паблізу ўзроўню, які склаўся ў чэрвені (9,9 % — **БелТА**). У наступным інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў запаволіцца: па выніках 2021 года прырост спажывецкіх цэн ацэньваецца каля 9 %. Чакаецца, што да канца 2022-га інфляцыя ў гадавым вымярэнні наблізіцца да 6 %. Усё гэта прадвызначае неабходнасць працягу сумеснай работы ўрада і Нацыянальнага банка па далейшым запаволенні інфляцыі і замацаванні яе ў сярэднетэрміновай перспектыве на ўзроўні паблізу 5 %», — сказаў Дзмітрый Мурын. Паводле яго слоў, цяперашнія падыходы да рэалізацыі манетарнай палітыкі ў найбліжэйшы час захаваюцца. «Нацыянальны банк забяспечыць нацэленасць сваіх інструментаў на стрымліванне інфляцыйных працэсаў і забяспячэнне макраэканамічнай збалансаванасці. Акрамя таго, дзеянні Нацбанка будуць сканцэнтраваныя на аднаўленні рэсурснага патэнцыялу банкаўскага сектара шляхам фарміравання ўмоў, накіраваных на ўмацаванне даверу да нацыянальнай валюты і павелічэнне ашчаднай актыўнасці эканамічных суб'ектаў. Тым самым будуць фарміравацца ўмовы для падтрымкі аднаўлення тэмпаў эканамічнага росту. У сукупнасці дадзеныя падыходы дазволяць стрымаць інтэнсіўнасць інфляцыйных працэсаў і забяспечыць збалансаванае развіццё беларускай эканомікі», — адзначыў прадстаўнік Нацбанка.

### ЯК ПЕРАМАГЧЫ КІБЕРЗЛАЧЫНЦАЎ?

У Беларусі распрацоўваецца праект указа аб супрацьдзеянні махлярству ў банкаўскім сектары, паведаміў Ігар Магілевіч. Такія меры звязаны з тым, што ў Беларусі на працягу апошніх гадоў назіраецца значны рост злачынстваў, звязаных з крадзяжом грашовых сродкаў з дапамогай выкарыстання дыстанцыйных каналаў абслугоўвання кліентаў банкаў. Агульная колькасць кіберынцыдэнтаў у банкаўскай сферы сёлета за першае паўгоддзе павялічылася больш чым у чатыры разы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, галоўным чынам за кошт росту колькасці выпадкаў з выкарыстаннем метадаў сацыяльнай інжынерыі. Метадам, якія найбольш актыўна выкарыстоўваўся ашуканцамі, стаў вішынг.

Для аператыўнага абмену інфармацыяй Нацбанк рэалізуе праект па стварэнні аўтаматызаванай сістэмы апрацоўкі інцыдэнтаў інфармацыйнай бяспекі. «Патрабуецца актыўны ўдзел банкаўскай супольнасці па інтэграцыі банкаўскіх сістэм з аўтаматызаванай сістэмай. Разам з тым для дасягнення выніку ў барацьбе з кіберзлачынствамі і зніжэння іх колькасці банкам неабходна забяспечыць выкананне рэкамендацый Нацбанка па супрацьдзеянні махлярству ў галіне электронных плацяжоў, а таксама павысіць узровень узаемадзеяння з падраздзяленнямі праваахоўных органаў па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій», — падкрэсліў Ігар Магілевіч.

Адным шляхам

# СТРАТЭГІЧНЫ РЭСУРС

## На форуме ШАС прынялі наньчанскую ініцыятыву

**Форум ШАС па традыцыйнай медыцыне — 2021 прайшоў у гарадской акрузе Наньчан, што ў правінцы Цзянсу на паўднёвым усходзе Кітая.**

Гэта адно з важных мерапрыемстваў, прысвечаных 20-годдзю стварэння Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Тэма форуму — «Захаванне пераемнасці, інавацыйнае развіццё, узаемнае ўзбагачэнне, сумеснае выкарыстанне». Арганізатарамі выступілі Кітайскі камітэт ШАС па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве, Дзяржаўнае ўпраўленне па справах традыцыйнай медыцыны КНР і Народны ўрад правінцыі Цзянсу.

Каля 500 прадстаўнікоў з Кітая і дзяржаў — членаў ШАС узялі ўдзел у маштабным мерапрыемстве ў змяшаных фарматах «анлайн + афлайн». Як заўважыў у сваім відэазвароце **першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай СНАПКОЎ**, пандэмія каранавіруса стала сур'ёзным выклікам для сусветнай супольнасці. У пераадоленні яе наступстваў не павінна быць месца палітыцы, рознагалоссям. Згуртаванасць — галоўная місія міжнародных арганізацый. Адным з яскравых прыкладаў гэтага з'яўляецца дзейнасць ШАС. Удзельнікі дадзенай арганізацыі аказваюць адзін аднаму належную падтрымку. Адметным у плане пераадолення наступстваў пандэміі каранавіруса з'яўляецца супрацоўніцтва Беларусі і Кітая, якое падкрэслівае ўзорны характар канструктыўнага ўзаемадзеяння краін. Як нагадаў Мікалай Снапкоў, летась наша дзяржава першая ў свеце аказала гуманітарную дапамогу Паднябеснай у барацьбе з ковідам. Такія грузы пастаўляліся неаднойчы. Кітай, у сваю чаргу, падставіў плячо дапамогі Беларусі.

У тым ліку незаменным рэсурсам сталі магчымасці традыцыйнай кітайскай медыцыны (ТКМ). Як вядома, цэнтры ТКМ адкрыты ва ўсіх абласцях. Прымяненне адпаведных працэдур прадэманстравала высокую тэрапеўтычную эфектыўнасць. Як адзначыў Мікалай Снапкоў, сімвалічна, што цэнтрам распаўсюджвання сусветна прызнанага вопыту ТКМ стаў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Сёлета ў лютым тут быў падпісаны мемарандум паміж Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь, Інстытутам культуры і эканомікі Цзіньтаа і Кітайскай карпарацыяй інжынірынгу САМС. Новае прадпрыемства-рэзідэнт ТАА «Новаэра Біятэх» створана пры ўдзеле Інстытута культуры і эканомікі Цзіньтаа, клінікі кітайскай медыцыны і кампаніі фармацэўтычных тэхналогій Сішаньцінсюэ (Пекін). На першым этапе плануецца арганізаваць вытворчасць медыцынскіх прэпаратаў для лячэння каранавіруса. Таксама прадугледжана стварэнне Еўразійскага цэнтра традыцыйнай кітайскай медыцыны для абмену вопытам, дыягностыкі і лячэння захворванняў.

Чарговы крок супрацоўніцтва ў медыцынскай галіне — кітайска-беларуская зона паглыбленага супрацоўніцтва і міжнародны парк традыцыйнай кітайскай медыцыны і аховы здароўя. У канцы ліпеня ў «Вялікім камені» было падпісана адпаведнае пагадненне. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел кіраўніцтва Дэпартамента Еўразіі Міністэрства камерцыі КНР, Пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь, УП «Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя», Адміністрацыі і Кампаніі па развіцці індустрыяльнага парка, а таксама кіраўніцтва профільных ведамстваў горада Цындаа і прадстаўнікі ствараемага праекта з ААТ «Кітайская карпарацыя інжынірынгу САМС», Інстытута культуры і эканомікі Цзіньтаа і Zhongheng Glory (Beijing) Technology Co., Ltd.

У інфармацыйнай прасторы шмат напісана аб выкарыстанні разам з некаторымі вядомымі супрацьвіруснымі прэпаратамі і травяных формул ТКМ для лячэння пацыентаў з COVID-19. Гаворка ідзе аб прыродных лекавых сродках, якія стымулююць імунітэт. Гаа Сяоцзюнь, прадстаўнік Пекінскай камісіі па ахове здароўя, заявіў, што ТКМ унесла значны ўклад у выздараўленне пацыентаў. «Традыцыйная кітайская медыцына адыгрывае актыўную ролю ў павышэнні хуткасці выздараўлення і зніжэнні ўзроўню смяротнасці сярод пацыентаў», — заўважыў эксперт. Як вядома, падчас эпідэміі COVID-19 каля пяці тысяч урачоў з многіх клінік і бальніц ТКМ былі накіраваны ў правінцыю Хубэй для ўдзелу ў лячэнні пацыентаў. Яны прыгатавалі на месцы дзясяткі тысяч доз адвараў з зёлак.




Так што рэсурс насамрэч стратэгічны, і асабліва на фоне выклікаў часу, звязаных з пандэміяй каранавіруса. На форуме была прынята «Наньчанская ініцыятыва аб развіцці супрацоўніцтва». У ёй адзначаецца, што традыцыйная медыцына (ТМ) адыграла актыўную ролю ў глабальнай барацьбе з пандэміяй і служыць апорай для аховы здароўя народаў краін свету. Дзяржавы — члены ШАС ажыццяўляюць шырокі абмен і супрацоўніцтва па падрыхтоўцы кадраў, у галіне медыцынскіх і навуковых даследаванняў і засваенні рэсурсаў лекавых траў.

Падыходы ТМ, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, маюць вялікае значэнне для ўдасканалення і развіцця нацыянальных медыцынскіх праграм. Краіны імкнуцца да больш цеснай інтэграцыі традыцыйнай медыцыны з сучаснай. Наньчанская ініцыятыва прадугледжвае актыўнае прасоўванне даследаванняў ролі ТМ у захаванні здароўя і ў прадухіленні, дыягностыцы, лячэнні фізічных і псіхалагічных захворванняў, паляпшэнні стану. Гэта робіцца дзеля таго, каб традыцыйная медыцына працавала больш бяспечным і эфектыўным чынам. На прасторы ШАС плануецца выяўляць унікальныя перавагі традыцыйнай медыцыны ў супрацьдзеянні такім агульным выклікам, як хранічныя захворванні, успышкі новых эпідэмій.

Варта развіваць супрацоўніцтва ў галіне выкарыстання лекавых траў у традыцыйнай медыцыне. Неабходна стымуляваць практыку па навучанні ў дадзенай сферы і падрыхтоўцы прафесійных работнікаў, нарошчваць абмены паміж пастаўшчыкамі і гандаль адпаведнымі паслугамі. Як адзначаецца ў ініцыятыве, інавацыі традыцыйнай медыцыны аказвае пазітыўны ўплыў на прагрэс сусветнай цывілізацыі. У яе бясспрэчных перавагах удзельнікі форуму маглі пераканацца самастойна. Яны наведалі вытворчую базу «Даліны лекаў» карпарацыі Цзянчжун, а таксама навукова-інавацыйную зону па традыцыйнай кітайскай медыцыне горада Наньчан.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**